# «Доля»

Доля шчодрасці рэдкай дасталася мне:
Толькі з кніг і з кіно зведаў я аб вайне,
На прарыў не вадзіў батальёны.
Я не бачыў крыві ў акопах, смярцей,
Крыкаў-плачу не чуў у агні я дзяцей.
Лік ахвяраў вайны – міліёны!

Мне расказваў аб ёй франтавік-ветэран
Без рукі, са слядамі асколачных ран.
Юнаком на вайну быў прызваны.
Для яго горшых бед не было, чым вайна.
Колькі лёсаў людскіх паламала яна!
Мы ў вечным даўгу, ветэраны.

Засталіся герояў адзінкі ў жывых.
Я сто грам падымаю за вас, франтавых,
За бясцэнны для нас падарунак.
Скора восем дзесяткаў, як мір, цішыня,
Клёкат белых буслоў, рытм рабочы штодня.
Як аддзячыць ахвярны рахунак?!

Наша памяць няхай будзе платаю вам,
Смех дзяцей і шчаслівыя твары ў мам,
На магілах ля помнікаў кветкі.
Мір на Белай Русі ў надзейных руках!
Пранясуць подвіг ваш пакаленні ў вяках,
Збажыною аддзячаць палеткі.

Каб такая ў жыцці доля выпала мне –
Кожны трэці загінуў зямляк на вайне…